Мікола Цэлеш

ЯНКА СЕЯЎ — ЛЮДЗІ ЖАЛІ

Ніколі й нідзе ня трацілася столькі чалавечай энэргіі на доказ вольнасьці, роўнасьці, сацыяльнага дабра й іншых атрыбутаў наземнага раю, як у «сацыялістычнай бацькаўшчыне». І ніколі й нідзе не было столькі супярэчнасьцяў між словамі й справамі, як пайменна там. Вось урачыстасьці кастрычніцкай рэвалюцыі, якія, як ведама, прыпадаюць на 7-е лістапада. Да гэтага рыхтуюцца тысячы розных брашураў, артыкулаў, выступленьняў, успамінаў, апісаньняў. Усе друкарні ўва ўсіх рэспубліках мабілізаваныя надрукаваць іх ва ўдарным парадку ў мільённых тыражох і разаслаць праз адпаведныя ворганы й арганізацыі, гэта значыць — праз райкомы, абкомы ў самыя далёкія куточкі. Апрача таго, пачынаючы з 6-га лістапада, і нават раней, пэрыядычныя выданьні запоўненыя прыгатаваньнямі да надыходзячых урачыстасьцяў. Чыноўнікі партыйнага апарату: райкомаў, абкомаў, ЦККП(б) саюзных рэспублік і самога ВКП(б) — разьмеркаваныя й разьяжджаюцца па хвабрыках, заводах, шахтах, сёлах, вёсках і аулах. І дзень і ноч грымяць радыёрупары літаральна з усіх перакрыжаваньняў аб тым жа. Партрэты, сьцягі, лёзунгі, ілюмінацыі — усе ў чырвоным колеры — і ўсё гэта мусіць сьведчыць аб дасягненьнях, аб волі, аб шчасьці пад савецкай зоркай.

I

Кузьма Вальтэр атрымаў пяць год Калымы за дурноты. У палітыцы ён разьбіраўся мала, быў хутчэй чалавекам пасыўным: сярод студэнтаў вылучаўся сваімі здольнасьцямі. Гэтым апошнім крыху злоўжываў, што ўласьціва амаль усім або ва ўсякім выпадку шмат каму зь юнакоў. І калі на сцэне, у дзень кастрычніцкіх урачыстасьцяў, зьяўляўся той ці іншы прамоўца з сваім неадменным «падвядзеньнем вынікаў», ён знаходзіў для яго вельмі трапную характарыстыку. Гэта сьмяшыла сяброў, якія сядзелі побач, і на іх нехта нябачны зьвярнуў увагу. Затым, ужо на банкеце, якімі заўсёды канчаюцца ўрачыстасьці, была зробленая й другая неасьцярожнасьць.

А тут якраз і трэба асьцерагацца больш за ўсё, бо НКВД, бясспрэчна, ведае: «што ў цьвярозага ў галаве, тое ў п'янага на языку».

...Сядзелі хеўрай за сталом, налівалі «нарзан» (ад слоў «і нарэзаўся, напіўся»), налівалі «нарзан» у шклянкі, як сьлед на падобных дармовых папойках. Расказвалі адзін аднаму ўсе мажлівыя гісторыі, сьмяяліся. Кузьма быў у цэнтры ўвагі. Часам да іх падыходзіў хто-колечы зь кіруючых, напрыклад парторг, вучком або й зусім хто-небудзь незнаёмы, і таксама падымаў напоўненую шклянку.

— Ну, сябры, вып'ем! Чаго ж там, на тое і сьвята, каб усім было весела!

Стукаліся шклянкамі, праліваючы гарэлку на стол, і выпівалі.

— Хроніка зазначае: расеец выпіць ня дурань! — заўважыў раптам Кузьма. — Вось, на што-небудзь іншае, дык глузду часам не хапае, а выпіць?!.

— Ну, Кузьма, гэта ты ўжо беспадстаўна... Былі б у мяне такія здольнасьці...

— А хто сказаў, што я расеец?

— Ну, усё ж «малодшы брат!?»

— Зусім не! Чуеш, як гучыць маё прозьвішча? Можа быць, крыху немец, крыху ангелец, прасьцей кажучы — цэлы інтэрнацыянал ува мне адным!..

— Што ж, гэта ня так і дрэнна, ува ўсякім разе на гэным этапе!..

Кузьма працягваў:

— Апроч таго, калі б быў і расеец, дык гэта зусім супярэчыць таму, што я сказаў, бо вось ужо год, як пішу дысэртацыю па дыямату і ніяк не магу скончыць!..

Усе весела засьмяяліся.

— Так, маючы такую нагрузку, як ты!.. Ты ж прыходзіш на лекцыі толькі паспаць.

— А якога чорта там рабіць? Выйдзе, вось, гэтакі петушок і пачынае кукарэкаць аб дыялектычным разуменьні... Трэба ведаць: «дыялектыка што дышла, куды павернеш, туды і вышла...»

Зноў усе гучна засьмяяліся. Але знайшоўся і такі, што папераджальна сказаў:

— Цішэй, хлопцы! Непрыстойна ж усё-такі так!

Гэта быў аднакурсьнік Кузьмы й ягоны першы сябра Нупрэй Орлік.

— Што непрыстойна? Сьмяяцца? Ты, як будучы лекар, мусіш хутка рэцэпты выдаваць на сьмех, бо, зразумей, памірае...

— А гэта востра, усё ж: дыялектыка, што дышла... — заўважыў студэнт Алесь, калі зноў аднавілася цішыня.

— Ты, Ляксей, чалавек Божы, відавочна п'яны? Дыялектыка — гэта аснова марксыцкага пазнаньня існуючага! — раптоўна атакаваў яго Орлік. — І чаго тут сьмяяцца?

— Сяньня сьмяяцца ўсім можна! — умяшаўся Кузьма.

— І ты сяньня, Кузьма, таксама...

— Дыялектыка — гэта ёсьць спосаб давесьці... — сур'ёзна загаварыў Алесь.

— Давесьці, што ты грыб, а не студэнт! — пасыпалася на яго з усіх бакоў.

— Хай сабе грыб, але першы, Баравік (такім было ягонае прозьвішча)!

— Ну і баравік! Проста атрутны мухамор, смаршчок!..

— Я нават скажу, што і не смаршчок, а звычайны грыб неазначанага роду, шаплык, як кажуць у нас.

Зноў усе весела засьмяяліся, і гэты інцыдэнт быў бы скончаны, калі б не ўмяшаўся нехта пабочны.

— Пра што спрэчкі? — спытаў.

— Ды ні пра што! — быў адказ. — І наагул, ніякіх спрэчак няма.

— Дыялектыка, што дышла... — усё ж захіхікаў Алесь Баравік. — Не, як сябе хочаце, а гэта прамоўлена...

Адразу ж усе прыціхлі.

— А вы ведаеце, грыбы ж самі сеюцца, — заўважыў Орлік, шматзначна пераглядаючыся зь сябрамі. — Таксама, як дурні.

Гутарка адразу ж спынілася, бо намёк быў вельмі яскравы. Але моўчкі сядзець было няёмка, і нехта запрапанаваў:

— Давайце засьпяваем!

— Не, гэта наробе шмат шуму, якога й так у залі хоць адбаўляй!

Сапраўды, за сталамі амаль нікога ўжо не было. Хадзілі, курылі, гучна размаўлялі; недзе стукалі більярднымі кіямі; нехта гістэрычна рагатаў — нейкая падвыпіўшая дзяўчына. І ўсё гэта пакрывалася шалёным звонам фартап'яну, на якім нехта стараўся ўзяць: «У Кацюшы вырасьлі ігрушы» *, але з-пад п'яных пальцаў высклізалі клявішы. Урэшце, яму ўдалося схапіць матыў і адразу ж падхапілі няроўныя крыклівыя галасы:

* Пераробка вядомай савецкай песьні.

У Кацюшы вырасьлі ігрушы,
Бо ночку ў садзе правяла...

— Вось, бачыце? Папросім лепей Кузьму прачытаць што-небудзь, — запрапанаваў Орлік.

— Які-небудзь верш!

— Які там верш! Ён можа нам цэлага Джамбула на памяць выкласьці.

— Маналёг Раскольнікава — ён прыхільнік Дастаеўскага.

— Ён прыхільнік Дастаеўскага? — пачуўся голас таго ж незнаёмага, які пытаўся толькі-што аб спрэчцы, але некуды быў адыйшоў і цяпер зноў стаяў за сьпіной Кузьмы.

— Сьледчы! — адразу ж прыйшла адна і тая ж думка шмат каму.

Орлік заўважыў:

— Мы студэнты! Мы мусім вывучаць ня толькі тое, што выклікае спачуваньне, але й тое, што ўпакарэньне...

Кузьма больш адчуў, чым зразумеў, што акалічнасьці склаліся неяк нядобра. Але яго нешта штурхала, як гэта нярэдка бывае зь не зусім цьвярозымі людзьмі — зьдзівіць чым-небудзь прысутных. Ён падняўся, каб голас ягоны больш даходзіў да слухачоў, і прадэклямаваў верш Янкі Купалы, верш, які быў, быццам, забаронены, але тым ня менш ня сходзіў з вуснаў людзей. У вершы гэтым шмат разоў паўтараліся радкі:

Янка сеяў — людзі жалі,
А зязюлька кукавала:
Ку-ку! Ку-ку!

Чытаў Кузьма сапраўды добра і заслугоўваў на пахвалы, але калі скончыў, наўкола стаяла амаль мёртвая цішыня.

II

Здавалася б, усё гэта дзяціныя гульні, на якія ня сьлед зьвяртаць увагі. Толькі пару гадзінаў таму, на ўрачыстай частцы вечара, столькі было слоў пра волю. А ўсё ж і гэтым нехта зацікавіўся. Першым пра гэта даведаўся Орлік. Кузьма яшчэ ляжаў у ложку з кнігай у руках (студэнты жылі ў інтэрнаце), калі Орлік падыйшоў да яго. Быў усхваляваны, або, праўдзівей, прыгнечаны. Аблакаціўся на ложак супраць Кузьмы, і вочы іхныя спаткаліся. Кузьма адразу ж зразумеў: нешта здарылася. Запытаў:

— Хворы ці што зь перапою?

— Так, хворы, і вельмі сур'ёзна хворы... — скрывіўся. — Але як мне сказаць табе пра гэта?..

— Што за дурноты! Язык у цябе прысох?

— Здаецца, на цябе зрабілі данос. Але ведай: я табе пра гэта нічога не казаў; у мяне й без таго клопатаў хапае...

— А што такое?

— З бацькамі нядобра.

— А што зь імі ёсьць: раскулачаны, высланы?

— Пакуль не! Але, вось, прычапіліся, што некалі мелі малатарню, пазычалі яе суседзям, ну, значыць, эксплюататары, карысталіся чужой працай.

— Тут нямашака лёгікі...

— Ты шукаеш лёгікі? — Орлік прыкра ўхмыльнуўся. — Не шукай яе цяпер, асабліва пасьля даносу — будзь асьцярожным!

— Пра які данос ты ўжо ў другі раз пляцеш?

— Я ж сказаў: на цябе ёсьць данос.

— На мяне?

— За ўчарайшае, я так думаю.

— А што ўчора адбылося? — задумаўся. — Ах, гэта! Які можа быць данос, калі я зусім сумленны! Ды пры тым яшчэ — уроджаны пралетар!?

— Ну, як хочаш!

— Але адкуль у цябе гэтакія весткі?

— Бачыў, як Алеська празьмерна пасьпешна выскачыў із спэцаддзелу.

— На падставе гэтага ты мяркуеш, што на мяне данос? Але ж ён ходзе туды амаль штодня, бо яму даручана рэгістрацыя вайсковаабавязаных! Якая дурнота! І пра што на мяне могуць даносіць, калі я чысты, як крышталь?

— Ну, не скажы, і на крыштале могуць выявіць лішаі, калі гэта патрэбіцца.

— Але ж у цябе няма ніякіх ня толькі доказаў, але й пасьлядоўнасьці?!

— Бачыш, Алесь тут раззваніў пра ўчарайшае па ўсяму ўнівэрсытэту і стварылася ўражаньне...

— Учора я ня быў п'яны і дасканала памятаю ня толькі кажнае слова, але й гэст, зь якім яно было выказана. Тое, што пажартаваў з прафэсара па дыямату? Але ж зь яго сьмяюцца ўсе.

Гэтая гутарка адбылася, як было ўжо зазначана, раніцой на наступны дзень пасьля ўрачыстасьцяў, а гадзіне чацьвертай нечакана зьявіўся загадчык спэцаддзелу таварыш Падкаблук. Прайшоўся разы два па залі, кінуў позіркам на ложак Кузьмы. Хаця той, здавалася, і не прыняў блізка да сэрца паведамленьня свайго сябры Орліка, усё ж ён, пэўне, непакоіўся. На працягу цэлага дня нікуды не выходзіў, за выключэньнем, як на

палудзень у сталоўку, на які затраціў каля гадзіны. Як толькі вярнуўся, зноў разьдзеўся і лёг на ложак. Узяў у рукі кнігу, але чытаньне ў галаву ўжо ня йшло. Дзіўна! Данос? Які можа быць данос? На мяне! Хіба ня ведама, хто я? І што мог раззваніць асёл Алесь? Дыялектычнае разуменьне... Хіба гэная фраза такая страшная? Вершы Янкі Купалы? Але ж ён народны паэта! І, здаецца, яшчэ па-за западозраньнем!.. Дурнота нейкая. Не, Орлік проста здэнэрваваны сваімі асабістымі справамі — непрыемнай сытуацыяй з бацькамі і свой настрой перадае іншым. Адклаў у бок кніжку й задумаўся. Хай сабе даносяць — ён зусім спакойны. Зноў пачаў пазіраць у кніжку, але радкі, быццам жывыя, рушыліся й расплываліся перад ім. Гэта пройдзе — трэба толькі прагуляцца. Падняўся, апрануўся й выйшаў на калідор. Насустрач яму ішоў таварыш Падкаблук, быццам ён спэцыяльна нейдзе тут яго чакаў.

— Вось і добра! — падумаў, адчуваючы ўсё ж, як моцна загрукала сэрца. — Можна будзе зь ім пагутарыць, намякнуць яму на данос, — якая ягоная будзе рэакцыя?

Але Падкаблук, не дайшоўшы да дзьвярэй інтэрнату, сам паклікаў студэнта пальцам.

— Зайдзіце да мяне на хвілінку! — прашаптаў, як бы баючыся, каб хто не пачуў. — Ведаеце, куды? У спэцаддзел, нумар дзевяць.

Кузьма заглянуў яму ў вочы і ўбачыў у іх нешта хітрае, лісьлівае і, разам з тым, пагрозьлівае, небясьпечнае.

— Калі — цяперака?

Падкаблук ледзьве не падскочыў.

—Чаго ж вы крычыцё? Чаго крычыцё? — засіпеў. І потым зь незадаваленьнем: — Ну, зразумела, цяпер, а ня заўтра. — Азірнуўся і зноў зашаптаў, ужо ветліва: — Перад тым як увайсьці, пастукайце ў вакенца, вось так во! — І пальцам пастукаў аб сьцяну, паказваючы, як трэба. — Пашпарт не забудзьце, так пашпарт!.. — папярэдзіў.

Павярнуўся й пайшоў у той бок, адкуль зьявіўся.

— Дзіўна! — Кузьма адчуваў, як пачынае разьбіраць хваляваньне.

Вярнуўшыся ў залю, забраў дакумэнты і ўзьняўся нагару. Але пакою нумар дзевяць нідзе не было — усё ішлі сотні. Ён успомніў: нумары, для большай зручнасьці, ідуць ад сотні. Падышоў да нумару 209. Праўда, у дзьверы было ўробленае невялічкае акенца, такое невялічкае, каб толькі можна было зазірнуць на калідор. Пастукаў, як вучыў Падкаблук. Акенца

адчынілася нібы аўтаматычна, і паказаўся твар заўспэцаддзелу. Быў як бы заклапочаны, павекі падміргвалі.

— Ага! Вы? Заходзьце!

Францускі замок на дзьвярох мякка пстрыкнуў, і дзьверы бяз шуму адчыніліся. Як толькі Кузьма пераступіў парог, зараз жа зачыніліся.

— Ну, вось і добра. Сядайце!

Кузьма азіраўся. Ён і на думках ня меў, што пры ўнівэрсытэце можа быць установа нагэтулькі засакрэчаная. Дзьверы, сьцены, столь, нават рамы акон, дзе мог пранікаць гук, былі абкладзены нечым мяккім, коркам або ватай, а можа быць тым і другім. Зьверху аббітыя цыратай. Падлога засланая мяккім і грубым дываном. Але мэблі было параўнаўча мала: тры-чатыры крэслы, апрача двух фатэляў, канапа з увагнутымі падушкамі й агнятрывалая шафа ў кутку. На сьценах вісела колькі партрэтаў: Ленін, Сталін, Дзяржынскі...

Падкаблук узяўся за адзін з трох тэлефонаў, што стаялі на стале. Потым перадумаў, паклаў слухаўку на месца й зьвярнуўся да Кузьмы:

— Ну што, пакукуем?

Студэнт зачырванеўся.

— Пашпарт пры вас?

Кузьма перадаў пашпарт.

— Уперад мушу вас папярэдзіць: сам факт, што вас сюды паклікалі, а таксама тое, аб чым з вамі тут размаўлялі, мусіць застацца таямніцай. Зразумелі?

Студэнт кіўнуў галавой.

— Калі ж бы выявілася, што вы свайго слова не стрымалі, будзеце адказваць, як за разгалошваньне дзяржаўнай тайніцы...

Потым Падкаблук пачаў дапытваць студэнта пра ягонае асабістае жыцьцё: дзе праводзіць час, зь кім спатыкаецца, якія вядзе гутаркі. Кузьма адказваў, што, апрача навукі, ён мае васьмігадзінную нагрузку ў школе, для гульні часу ня мае і таму знаёмствы ягоныя абмяжоўваюцца студэнцкім і настаўніцкім асяродзьдзем.

— А вы не знаёмы з палкоўнікам Міхалам Дуброўскім?

Кузьма зразумеў, што прозьвішча выдуманае, і спакойна адказаў:

— Ведаю аднаго Дуброўскага, сакратара райкаму, а ці палкоўнік ён, ці не, ня ведаю.

Падкаблук на момант як бы зьмяшаўся.

— Ага, так! А вось вытлумачце, як вы ўчора правялі вечар кастрычніцкіх сьвятаў: ці не здаралася з вамі чаго-небудзь асаблівага, ці не спатыкаліся вы з кім-небудзь такім?..

Кузьма перадаў усё пра вечар, як і было, бо дагадваўся, што Падкаблук дастаткова паінфармаваны.

— Так, нядобра! — заўважыў. — Вось жа вы там кідаеце розныя туманныя тырады... І гэты верш, як ён там — «Зязюлька кукавала» ці што?

— Янка Купала народны паэта, узнагароджаны ордэнам!

— Так, усё гэта так. Але бывае ўсялякае і зь вельмі вялікімі людзьмі, што ж казаць пра народных паэтаў?

— У вершы гэным няма нічога, што магло б...

— Вы так перакананыя? Гэта даволі дзіўна, прымаючы пад увагу ваш век. Я, напрыклад, знаходжу ў ім і вельмі шмат. — Ён узяў нейкі лісьцік паперы й пачаў: — Па-першае, высьмейваньне калгаснага будаўніцтва — адкрытае, яўнае. Вось нейкі Янка сеяў, а прыйшлі людзі і зжалі! Хіба гэта не намёк на беднату і не абарона кулака? Па-другое, у той час як Янка сеяў, зязюлька кукавала. Якая яна, гэтая птушка? А птушка яна такая, што не клапоціцца зрабіць сабе гнязда, а таму бяздомная. Хіба тут, у гэтай бяздомнай птушцы, ня відавочны намёк на пралетарыят, вясковую беднату, ліквідацыю прыватнай уласнасьці на адной шостай зямной кулі? Не працуюць, ня дбаюць, а, як Янка пасее, сажнуць. Так, Янка Купала народны паэта, адзначаны ордэнам, пакінем яго ў баку, хай жыве сабе на здароўе, пакуль што... Але чытаць такія вершы публічна?! Адно толькі аблягчаючае віну ёсьць ува ўсім гэтым тое, што вы нічога не схавалі, паведамілі пра ўсё, як было, і калі захочаце пакапацца ў сваёй памяці і ўспомніць тое, што зь вечарам не зьвязана, але мае для нас вялікае значэньне, дык вам гэта дапаможа знайсьці правільны шлях у будучыні...

Як гэта ня дзіўна, Кузьма зарагатаў, зарагатаў ад усіх гэтых бязглуздых інтэнцыяў і выдумак. Падкаблук зірнуў на яго ўніклівым позіркам. Але тут быў усё ж унівэрсытэт, і ён нічога лепшага не знайшоў, як толькі змаўчаць. Узяў ручку тэлефону, прыклаў да вуха. Ціха і доўга размаўляў зь некім. Потым таксама ціха зьвярнуўся да Кузьмы:

— Вельмі шкадую, але абавязаны параіць вам безадкладна зьявіцца ў вадну паважаную ўстанову на Савецкай. Вы, зразумела, дагадваецеся, у якую! Не палохайцеся, яна страшная толькі для дывэрсантаў, шпіёнаў, контррэвалюцыянэраў і падобнае брыды. Людзей жа сумленных яна бярэць пад сваю апеку...

І ён пачаў тлумачыць, як патрапіць у гэтую ўстанову, куды для гэтага патэлефанаваць і да каго зьявіцца.

III

Кузьма, не заходзячы ў інтэрнат, выйшаў. Ідучы, ён ня стаў разьбірацца ў тых супярэчнасьцях, якія хаваліся ў апошняй заўвазе Падкаблука адносна паважанай установы. Ён спадзяваўся: там разьбяруцца. Страшная для дывэрсантаў, шпіёнаў. Ён жа не дывэрсант, не шпіён, і ня контррэвалюцыянэр. Яму ня можа пагражаць нічога благога. Тое, што тутака нагаварыў гэны крэтын, проста плюгаўства, на якое ня сьлед зварачаць увагі.

Увайшоў у пад'езд паважанай установы, знайшоў тэлефонную будку, набраў паданы Падкаблуком нумар. Яму нехта адказаў:

— Трэба чакаць, выклічуць.

Добра, калі не сьпяшаюцца. Значыцца, няма й ніякай небясьпекі. Проста разьдзьмуханы пажар. Не сьпяшаюцца! Ён прайшоўся па прыймовай залі. Агледзеў сьцены з партрэтамі й лёзунгамі. Прачытаў на адным: «ЧК-ГПУ-НКВД — вартаўнік рэвалюцыйнай законнасьці». Што тут страшнага? Наадварот, вельмі добра. Якое ж жыцьцё без законнасьці? Выглянуў праз акно, застаўленае кратамі. На дварэ ціха, нідзе ніякіх жахаў. І чыста, культурна. Як відаць, і напраўду больш выдумак пра гэтую ўстанову. Злыя языкі, таму што сьцірае з твару зямлі дывэрсантаў, шпіёнаў, контррэвалюцыю. Для іх можа быць страшная. Засьвістаў нейкі матыў, як свой чалавек у гэтай установе, і сеў на адну з лавак, што стаялі каля сьцяны і на якіх ужо сядзелі, галоўным чынам, чамусьці жанчыны. Якраз у гэты час акенца адчынілася, і яго выклікалі па імені й прозьвішчы.

Як толькі ён зайшоў за дзьверы, зь ім цацкацца ня сталі: скамандавалі падняць рукі ўгару і абшукалі кішэні. Потым прымусілі разьдзецца аж да ніжняе бялізны. Заглянулі ў рот, у вушы, між пальцамі рук і ног, пад пахі, між ног... Круцілі налева, направа, нешта сьпісвалі; глядзелі ў твар і ў вочы; зьмерылі і зважылі; ашчупвалі кажны рубец і кажны гузік у вопратцы. Урэшце, загадалі апрануцца. Ну, цяпер мабыць адпусьцяць. Але яго павялі ў нейкі калідор і загадалі чакаць, пакуль зноў ня выклічуць. Стаяла адна-адзіная лаўка і ён сеў. Гумар ягоны адразу ж зьнік. Абразьліва было ўспамінаць, як яго абшуквалі. Што ж гэта? Выходзіць — арыштант?! Хацелася то плакаць, то крычаць, то ісьці ламаць дзьверы й вокны. Чакаў хутчэйшага выкліку, хацеў пратэставаць і спадзяваўся, што, можа быць, тады выпусьцяць. Але ніхто не прыходзіў. І наагул у калідоры было зусім ціха, пуста, толькі час ад часу недзе далёка, мабыць у «амэрыканцы», аб існаваньні якой ён чуў, недзе там брынчэлі

нейкія зялезныя запоры. Цяпер інтэрасы навукі, працы, адпачынку, сну і ўсяго іншага, чым жыў чалавек, адышлі на задні плян. Ламаў пальцы. Раптам яму стала зімна. Здавалася, на дварэ сьцюдзёны дождж ізь сьнегам, тады як толькі што было цудоўнае надвор'е.

Ён сядзеў ужо гадзіну, другую, трэцюю... Ім ніхто не цікавіўся. І ад гэтага думкі находзілі самыя змрочныя. Урэшце ён падумаў: ці не ўцячы яму адгэтуль? І хай тады вырашае лёс. Ён паспрабаваў адчыніць адны дзьверы, якія, на ягоную думку, маглі б вывесьці на вуліцу або куды-небудзь у цёмны кут двара. Але за дзьвярыма быў нейкі катух, у якім стаялі насілкі, а на іх ляжалі вымачаныя крывёю анучы, два раменныя бізуны, цьвікі, малаток, а з боку стаяла вядро з вадой, таксама разбаўленай крывёю. Не пасьпеў ён зачыніць з агідай дзьвярэй, як з пакою насупраць нехта выйшаў і спыніўся ў яго за сьпінай. Кузьма так спалохаўся, што баяўся варухнуцца й азірнуцца. Але той, хто стаяў за сьпінай, храпавіта сказаў:

— Пойдзем!

Пакой, у які яго ўвялі, быў невялікі, але ён злучаўся з двума іншымі — налева й направа. Дзьверы ў іх былі адчыненыя. Каля адных зь іх, паставіўшы крэсла проста на праходзе, сядзеў зь вінтоўкай баец. Кузьма зразумеў, што цяпер яму адсюль ужо ня выйсьці, і ён мэханічна спыніўся на парозе. У другім пакоі, за вялікім сталом, заваленым справамі й паперамі, стаяў чалавек у вайсковай форме з малінавымі пятліцамі. Твару ягонага не было відаць, бо ён глядзеў у паперы.

Сонца ўжо вісела на кончыку дугі, якую яно робіць ад усходу да заходу. Крывавыя праменьні, ахварбаваўшы неба ў заходняй яго частцы, нацэліліся ў вокны. І ўсё ў гэтым пакоі — і людзі й рэчы — здаваліся чырвонымі, быццам залітымі крывёй. Кузьма стаяў і чамусьці доўга глядзеў на кончык штыха — добра адточаны й таксама заліты сонцам. І яму здалося, што і з штыха сочыцца кроў...

Раптам той, у вайсковай форме, узьняў галаву, кароткім позіркам зіркнуў на Кузьму і як бы засьмяяўся.

— Філёзаф! — прамовіў.

І зноў панік у чытаньне папераў.

Прайшло хвілін пяць або дзесяць. Кузьма не варушыўся. Ногі ягоныя зьдзервянелі, у вушах зьявіўся шум. Ён адчуваў, што тоне, і яму хацелася крычэць аб дапамозе, як некалі ў дзяцінстве, калі ён сапраўды тануў.

— Ку-ку! — зноў адгукнуўся вайсковец.

І зноў апусьціў вочы ў свае паперы. Потым, ужо сувора, да байца:

— Ну, што ж ён будзе стаяць? Адвядзі яго ў вадзіночку «амэрыканкі», хай там пакукуе!

IV

Кукаваў Кузьма ў «амэрыканцы» досыць доўга, каля дзевяці месяцаў. Потым яго асудзілі завочна на пяць год Калымы. Адпрацаваўшы чатыры з паловай гады, справу ягоную раптам патрабавалі на перагляд. Што было прычынай гэтага і ці на карысьць яму гэта, ці на шкоду, Кузьма ня ведаў. Але калі яго пасадзілі ў вагон і павезьлі на захад, у яго, быццам бы, зьявілася радасьць. Не таму, што ён спадзяваўся на нешта. Ён пагадзіўся ўжо зь няшчасьцем, было дастаткова часу, каб зразумець, што маладое жыцьцё ягонае пакалечанае, зламанае, і цяперака, каб нават выпусьцілі, яму ўжо ня ўзьняцца, не папасьці зноў ва ўнівэрсытэт, не заняць адпаведнага месца ў жыцьці, — заўсёды і ўсюды над ім будзе цяжэць гэтае «рэпрэсаваны». Але, так ці іначай, ён едзе ў родныя мясьціны, дзе цьвітуць яблыні й цудоўна сьпяваюць птушкі, дзе жыцьцё выкавала яму душу. З вакна вагону ён спадзяваўся ўбачыць родныя хаткі, крытыя саломай; палі, па якіх бегаў босым; рэчкі й ручаі, у якіх нырцаваў у пошуках рыбаў; лясы, у якіх лазіў па дрэвах і зьбіраў ягады. Спадзяваўся пачуць родную гаворку. Пасьля дзікай Калымы гэта было так шмат!

Выгляд у Кузьмы быў больш чым сумны: высах, пачарнеў, згорбіўся, ня гледзячы на свае дваццаць шэсьць год. Залягло ў вачох цяжкое ўпакарэньне, і калі б яго цяперака ўбачыла маці, яна магла б не пазнаць. Нават чэрап, і той быццам набыў іншую форму: занадта выпукаў ззаду, над шыяй, і хаваўся пад валасы сьпераду, што рабіла яго нізкім. Галіцца ў вязьніцы, а потым у ссылцы, не было ніякай магчымасьці, і ён разы два-тры на год бараду падпальваў, каб стала карацей. Ад гэтага яна хоць і губляла ў колеры, але расла значна гусьцейшая і лепей абараняла ад сьцюжы.

Падарожжа працягвалася больш за месяц. Яно было зьнясільваючым, галодным і халодным, ня гледзячы на вясну, але стан ягоны ўсё ж не пагаршаўся. Калі ж яго прывезьлі ў турму, у родную, як ён яе называў, і зусім павесялеў. Страшэнных допытаў яму не прадбачвалася — ён усё гэта пережыў ужо, на цяжкія працы не ганялі, ежа й абыходжаньне лепшыя, чымся ў лягерох. І калі б у камэры было хоць крыху вальней, ён палічыў бы гэта за шчасьце да канца сваёй адседкі.

...Была ціхая раніца. За вакном чылікалі вераб'і. Падагнуўшы каленкі сабе пад жывот, бо ногі выцягнуць не было куды, Кузьма ляжаў у найдалейшым куце камэры. Усе яшчэ спалі, таму што было зусім рана, толькі ўзышло сонца, якога, праўда, адсюль не было відаць. У камэры стаяла цяжкое паветра, хрып. Час ад часу нехта блюзьніў скрозь сон, капашыўся, стараючыся выпрастаць адляжалую руку ці нагу, паскрабсьціся пад лахманамі.

«Жыць стала весялей...»
«Я другой такой страны не знаю,
Где так вольно дышит человек!»

Пэўна, таксама думалі аб гэтай «стране» Аракчэеў і Мураўёў? Але чыліканьне вераб'ёў перашкаджала Кузьме думаць. І тады, як і заўсёды, як толькі заставаўся сам-насам, пачаў успамінаць родны кут, грушу пад вакном, дзяцінства. І там яны таксама ў гэты час праводзілі свае дыскусіі. Як даўно гэта было? І, здаецца, так нядаўна! Гэта ж толькі ўчора прыходзіла маці пераканацца, ці мякка будзе спаць? Так, старэнькая! Мабыць, і цяперака яшчэ кладзе падушку з надзеяй: авось прыйдзе! Ці жыве яшчэ? І наагул, ці ўцалела што: можа ўжо і ні хаты і ні вёскі нават? Раптам за вакном стрэл. Куля, ударыўшыся аб цэглу муру, прасьвісьцела ў паветры. Вераб'і ўсёй сям'ёй адляцелі. І, усьлед за тым, пачуўся енк з жаночага аддзелу. З чаго б гэта? Хіба жанчына можа зрушыць гэтыя цяжкія краты? Ніколі, здаецца, гэтага не было? Але тут жа ўспомніў: заўсёды так было, калі хто падыймаўся да вакна.

Прайшлі хвіліны. Вераб'і адзін па адным зноў занялі свае месцы. Шчасьлівыя: ім вось можна адлятаць і прылятаць. Сярод іх няма падзелу на добрых і злых, актыўных і пасыўных, бальшавікоў і небальшавікоў. Усе роўныя і ўсе вольныя. У гэты час за сьцяной пракацілася аўта. Кінуўшы думаць пра вераб'ёў, Кузьма стаў прыслухоўвацца: стане яно тут ці ня стане? Калі стане, значыць прывезьлі, як заўсёды ў гэтую пару, новых арыштантаў. Але шум аўта пакрыў новы — ішоў недзе цягнік. Цік-так-так! Гу-гу! Давай дарогу! Кузьма забыўся пра аўта й пачаў думаць пра цягнікі: вось, можа быць, ідзе цэлы транспарт туды, у тайгу, на Калыму... А можа едуць людзі, хто куды хоча. Але ўсё роўна:

Усе чатыры стораны
Для цябе адкрытыя.
Прыляцелі вораны,
І калы ў магілу ўбітыя...

Гэта ягоныя вершы, якія ён пісаў і завучваў на памяць у ссылцы. Так, калоў над магіламі панаўбівана ня сотні й ня тысячы. Калі высекчы пару дзясяткаў гектараў лесу, яго не хапіла б. Калы й калы — ударная работа сьмерці. І найбольш «малодшых братоў» — беларусаў, украінцаў...

...Вераб'і чылікалі...

Але, вось вясна. І добра ўсё ж, што тут, а ня там, калі нават і кол... І яму палка, амаль да сьлёз, захацелася пабываць на волі. Лонкі цяперака, — як прыгожа яны ўбраныя? І на рэчцы плаваюць, як на талерках, жоўтыя й бела-ружовыя гарлачыкі. Вось і разважайце, што такое шчасьце?! Ськінуць бы свае анучы й акунуцца, нырнуць туды, а потым ужо хоць бы і гэны кол... Шум цягніка зьмяніўся шумам самалёту, які, праўда, ляцеў недзе далёка або дужа высока. Кажуць: высока лятаюць шчасьлівыя. Яму хоць бы зірнуць на прастор, які адчыняецца адтуль, з вышыні, і потым параўнаць, як цесна тут воку! А так вось і памерці можаш за гэтымі сьценамі, нічога ўжо ня ўбачыўшы...

Раптам грукнуў страшэнны выбух — такі страшэнны, што замкі заскрыгаталі ў вязьнічных дзьвярох, як лютыя зьвяры зубамі, і здавалася, пахіснуліся самі муры. Каб гэта адбывалася не ў СССР, можна было б падумаць, што падкладзена міна. Тут такая магчымасьць выключаная. Усьлед за першым, пачуўся выбух другі, а потым трэйці... Змоўклі за вакном вераб'і. Вапна ад столі ўбяліла падлогу. Вязьні раптам паўскаквалі, трывожна аглядаліся.

— Што такое?

— А трасца яго ведае — нейкі выбух!

— Які там выбух — з гарматаў сьцябаюць!

Праўда, цяпер ужо зусім выразна «сьцябалі» з гарматаў, зацяўшы ў пярсьцёнак места (ва ўсякім выпадку так здавалася). Жалобным выцьцём уздымалі трывогу сырэны.

— Практыкаваньні, на ворагаў усё шыкуюцца!

Прайшло з паўгадзіны. Увесь гэты час гарматы стралялі безь перапынку, і было чуваць кружэньне самалётаў. Заціснутыя сярод сьцен, вязьні не маглі нічога зразумець — стаялі, слухалі, адзначаючы кажны гук, кажнае патрэсканьне муроў, і выказвалі свае меркаваньні.

— Практыкуюцца забіваць людзей...

— Ня нам судзіць! Мне б вось вырвацца найхутчэй адсюль... Зусім задарма ўскочыў...

Нехта зацягнуў расейскую песьню:

Понапрасну, Ванька, ходишь,
Понапрасну ножки бьеш,

Ничего ты не заслужишь,
Дураком домой пойдешь...

— Хай бы сабе й дурнем, абы вярнуцца...

— Аняго! Так табе й адчыняць дзьверы — сюды лёгка, а адсюль!

— Я й кажу: згніеш тут, у гэтых сьценах!

— Не мудрона! Вязьніца не курорт, сала тутака не загадуеш!

— А вось жа вытрымліваюць і па некалькі год. Бачыш, там сядзіць адзін, — паказалі на Кузьму, — на Калыме пяць год ужо адбарабаніў...

— Так. Але які вярнуўся?

У гэты час тупат ног на калідоры, бразгатаньне зялезных запораў, крык:

— Выходзь! З рэчамі выходзь!

— Рэвалюцыя? — прамовіў нехта. — Або вайна?

— Пастраляюць каты! — прарочыў адзін, жыцьцё якога й так вісела на валаску, бо пад пабоямі мусіў «прызнацца» ў самым цяжкім, у шпіёнстве.

Лянуў замок.

— Выходзь! Выходзь з рэчамі! Не затрымлівай!

Усе пасьпешна кінуліся ўніз. Каля сходаў стаяў вартавы й кажнага ўзнагароджваў прыкладам. Кузьма быў ужо дасьведчаны ў гэтай справе й праскочыў у яго за сьпінай. Пры выхадзе на двор яго нехта схапіў у вабдымкі.

— Кузьма, браток!

Той азірнуўся — перад ім стаяў Орлік.

— Жыў?

— Жыў! Як тамака?

— Дрэнь...

— А цябе за што?

— Ды ўсё ж па тваёй жа справе! Прынамсі, так дагадваюся з пытаньняў сьледчага...

Кузьма наморшчыўся: непрыемна было слухаць «па тваёй жа...» Але, разам з тым, высьвятлілася, чаму справу патрабавалі на перагляд.

— Пачакай, тут недзе Алесь, — сказаў Орлік. І пачаў клікаць: — Алесь, Алесь!

З натоўпу выйшаў Баравік. Зьбялелы й змучаны, ён быў не падобны да сябе.

Глядзеў на Кузьму й таксама не пазнаваў.

— У яго пры допытах пашкоджаны рэбры, — зазначыў Орлік.

Кузьма сьціснуў у сваіх абдымках Алеся, адчуваючы, як нейкая цяжкасьць спадае ў яго з сэрца. Да суду ў вязьніцы, а потым пасьля суду ў ссылцы, ён усё журыўся, што праданы сябрамі. Думаў: можа быць і так! Зайздрасьць, хвілёвая крыўда, жаданьне выслужыцца, стаць больш прыкметным маглі паслужыць спакусай. І да сэрца падступала цяжкая роспач, асабліва тады, як яго штурхалі прыкладамі. Але цяпер Кузьма якраз адчуваў сябе вінаватым і перад Алесем...

Людзей усё яшчэ праганялі цераз прыклады.

— Куды ж нас, куды? — енчыў, спалохана, Алесь.

— Трымайцеся мяне! — казаў Кузьма. — Я ў гэтых справах ужо маю дасьведчаньне.

Ад варот пачуўся крык:

— Станавіцеся па тры! Чаго стаіцё, як стада бараноў?!

— Ды няго ж хто? Зразумела стада! — працадзіў амаль дзяціным галаском нейкі чалавечак у вялікіх вайлаках, ня гледзячы на сьпякоту.

Пачалі станавіцца. Усе ўтрох сталі разам. Але хутка зьявіўся начальнік канвою. Зьяўленьне яго выклікала страх ува ўсіх палітычных. Гэта быў Нэрон — прыземісты, моцны, напорысты. Як не адгараджваецца НКВД усемажлівымі таямніцамі, і ў месьце, і ў вязьніцы ведалі пра яго шмат. Напрыклад, што ён лічыў сябе майстрам выконваць сьмяротныя прысуды. У тыя дні або тыдні, калі гэтакая праца адсутнічала, ён нудзіўся, ня еў, сядзеў панура ў сваім куце. Закідаў нават свае іншыя абавязкі — аднаго з камэндантаў. Некаторыя меркавалі, што ён заўсёды пад уплывам алькаголю. Ня праўда. Алькаголю ён зусім ня прымаў, а карыстаўся какаінай. Уцягнуўся ў яе з дазволу лекара, які праводзіў у вапошнюю дарогу сьмяротнікаў. Першая праца ніяк ня выходзіла чыста. Ён нэрваваўся, наган дрыжэў у ягоных руках. Вось тады лекар і падсунуў яму парашок. Пазьней ён атрымаў на какаіну санкцыю і карыстаўся ёй афіцыйна.

Як толькі Нэрон даведваўся, што ахвяра ўжо замкнутая ў вадзіночку, да яго вярталася жыцьцё. Ён ішоў у камэнданцкую даведацца аб часе катаваньня. Потым зь вялікім апэтытам зьядаў сьняданьні, палудні й вячэры, як марак перад штормам. Быў вясёлым, жартаваў зь людзьмі й забаўляўся з жонкай. Ці ведала яна пра ягоную працу? Можна дапусьціць, што ведала, бо Нэрон зусім не лічыў сваю працу горшай за другую, наадварот, перакананы чэкісты, ён нават ганарыўся ёю: не ўсялякі нават партыец заслугоўвае такога даверу.

Справу сваю ён запраўды ведаў дасканала. Усіх тых, каго прыходзілася ліквідаваць, ён падзяляў на тры катэгорыі.

Першая — гэта тыя, што з моманту ўзяцьця іх з камэры сьмерці гублялі ўсялякую волю над сабой і, па сутнасьці, ужо не жылі. Зь імі ён канчаў хутка: выцягнуўшы з машыны, настаўляў наган у чэрап і націскаў на курок. Другая — гэта гістэрыкі, што ў вапошнюю хвіліну пачыналі плакаць, кусаліся, кідаліся. Зь імі ён быў як бы мяккім, нават як бы чалавечым.

— Станьце, я аблегчу вашыя пакуты! — казаў.

Але ніякага жалю ў яго, зразумела, не было, ён гэтых ненавідзеў. І ў той час як яны ўставалі, падводзіў вочка нагану й канчаў. Трэйцяя — гэта волявыя характары. У дачыненьні да іх ён пераражываў пачуцьці, падобныя тым, што бываюць пры змаганьні. А калі так, дык усё ж зьяўлялася ў ім нейкая іскарка, хаця б сабе садыстычная. Ён выводзіў іх з аўта, ставіў на пэўнае месца і пачынаў нацэльвацца. Калі ахвяра скрыгатала зубамі й крычэла ў шаленстве: «Ну, страляй жа, сабака!» — адводзіў наган. Так прароблівaў некалькі разоў, даводзіў да газарту й сябе і ахвяру. Потым ужо нацэльваўся, як належыць, і спускаў курок. У момант, калі лекар зьяўляўся канстатаваць сьмерць, сядзеў у аўта і спакойна пакурваў.

Вось гэтай істоце ўцякаючыя галаварэзы з НКВД і даручылі эвакуацыю дому прымусовага адпачынку.

Як толькі ён зьявіўся на дварэ вязьніцы, гудзеньне галасоў замянілася шэптам:

— Нэрон! Нэрон!

Глядзелі на ягоны крыху рабаваты твар зь вялікім носам, загнутым, як у савы. Страх у некаторых быў настолькі вялікі, што яны стаялі белыя, як палатно.

— Што гэта будзе? Што гэта будзе?

Халодным, як сталь, зрокам Нэрон павёў па натоўпе.

— Адыйсьці ад сьцяны! — крыкнуў. — Стаць па тры: контра асобна, шпана асобна!

Да яго падскочыў баец і пачаў нешта гаварыць. Нэрон махнуў рукой. Кузьма добра ведаў, што ў няволі крымінальным лепей, чымся палітычным — менш прыпадае ўдараў прыкладам.

— Куды я, туды й вы! — шапнуў сябром, становячыся да крымінальных.

Калі мужчыны былі ўжо пастаўленыя і пачалі выводзіць жанчын, Нэрон меў кароткую прамову.

— Вы, контра сусьветная, такую вашую й растакую!.. Я з вамі цяпер распраўлюся! Я цяпер для вас і судзьдзя і міласьцівец! Калі хто адважыцца даваць драпача, усіх пастаўлю пад сьценку! Пастраляю як сабак! Зразумелі? Слухайце далей: хто

ліча сябе невінаватым — гэта датычыць тых, што пад сьледзтвам — пяць крокаў наперад! Хто хоча на волю, таксама пяць крокаў наперад!

Здавалася, пастка была зусім простай, але тут людзі аказаліся настолькі наіўнымі, што некалькі зь іх выступіла наперад, як загадваў начальнік. Гэта былі, галоўным чынам, навічкі, з Заходняй Беларусі.

— Адвядзіце іх у тыл двара! — загадаў Нэрон байцом.

Павялі, і потым пачулася некалькі стрэлаў. Натоўп замёр. Некаторыя потайкам перахрысьціліся.

— Вызвалілі! — уздыхнуў Кузьма.

Алесь дрыжэў і стукаў зубамі.

Калі былі выведзеныя і жанчыны, іх таксама пачалі ставіць паводля таго ж прынцыпу: контра асобна, крымінальныя асобна. Розьніца была толькі ў тым, што цяжарных ставілі асобна. Нэрон аглядаў усіх, заходзячы то сьпераду, то ззаду. У ваднае не аказалася дастатковых адзнакаў. І выгляд у яе быў яшчэ зусім сьвежы. Было відавочным, што яна тут усяго толькі некалькі дзён, узятая згодна загаду аб «изъятии подозрительных лиц» з прычыны вайны.

— Як на ймя?

— Мар'я.

— Ага, Марыя, прасьвятая дзева... За што ўляцела?

Тая паціснула плячыма.

— Ня ведаеш?

— Не.

— Прафэсія?

— Настаўніца, — адказала.

— Нацдэмка! Два крокі наперад!

Нэрон паклікаў байца.

— Вядзі ў лазьню, калі хочаш, — ёй жа цяпер усё роўна!

Баец глядзеў на начальніка.

— Ну, чаго стаіш — вядзі!

Баец пагнаў жанчыну штыхом. Нэрон заставаўся некаторы час на месцы, аглядаючы яшчэ раз апошніх. Потым пайшоў усьлед за байцом. Праз некалькі хвілін пачуўся стрэл.

Калі вярнуліся, ужо ўсе стаялі ў радох. З паўсотні байцоў, наставіўшы штыхі, абкружалі іх.

— Яшчэ гэтых у тыл двара! — наказаў Нэрон на групу цяжарных. — Усё ж роўна прыйдзецца ў дарозе ліквідаваць...

Адвялі...

Напасьледак вароты адчыніліся.

V

...Места гарэла. Гарэла страшна, цэлым морам агню, як могуць гарэць у сухую пагоду напалавіну драўляныя гарады. Будынкі, тэлеграфныя слупы, электрычныя кабэлі, асфальт — усё плавілася й шугала полымем. Агонь перакідаўся з будынку на будынак, з вуліцы на вуліцу, працягваючы жоўтыя языкі туды, дзе яшчэ не гарэла. Ляцелі ўніз галавешкі, валіліся цэлыя сьцены. Неба счарнела і, здавалася, абвісла, спаўзло ўніз, закрываючы сонца. Вось па гэтых палаючых, напоўненых жарам і дымам вуліцах іх пагналі на ўсход — бягом, без затрымкі.

Напасьледак выйшлі з пажарышча. Бег зьмянілі на крок, але сілы ў шмат каго забракла. Адзін вязень паваліўся. Да яго падскочыў Нэрон.

— Зь якой калёны?

— Палітычны, прыстрэльце, калі ласка...

І зьняволены, сьцяўшы зубы, уткнуўся ў пясок тварам. Нэрон павольна выняў наган, нацэліўся ў галаву і выстраліў. Спакойна паклаў наган на месца й паскакаў уперад. Праходзячы міма забітага, зьняволеныя ўкрадкам здымалі шапкі й хрысьціліся.

Алесь усё стагнаў:

— Куды ж нас? Куды?

— Маўчы! Маўчы — бачыш?

— Не, гэта не рэвалюцыя, гэта пэўна вайна...

Але запытацца не было ў каго: жыхары пакінулі места, пахаваліся...

Апынуліся за горадам. Крымінальных сьцераглі ня так пільна, як палітычных, і рады іхныя значна парадзелі. Гэта яшчэ горш злосьціла канвой супроць палітычных. Нэрон скакаў з канца ў канец расьцягнутай на кілямэтр калёны й час ад часу чулася траскатня аўтамату й нагану.

Па паўдні сонца прыпякло. Пыл засланіў небасхіл. Даймала прага, а да студняў, якія спатыкаліся па дарозе, не дапускалі. З учарайшага дня таксама нічога ня елі. Аслабелых зьявілася больш, і стрэлы чуліся часьцей. Алесь так мучыўся, што жыцьцё для яго згубіла ўжо каштоўнасьць. Ён прасіў сяброў:

— Дайце мне памерці! Дайце мне памерці!

Становішча ўскладнялася яшчэ тым, што Кузьма ішоў босы. Абутак ягоны, чырвонаармейскія старыя чаравікі, атрыманыя яшчэ на Калыме, канчаткова разьбіліся, і ён іх выкінуў. Гарачы пясок паліў яму ногі, жвір раніў іх да крыві. Кузьма стараўся ступаць ня ўсёй ступнёй, а толькі той яе часткай, якая менш балела. Гэта пазбаўляла яго цьвёрдай апоры, а трэба было яшчэ цягнуць і Алеся. Яны апынуліся ў хвасьце ўжо досыць далёка. На шчасьце, Нэрон быў нейдзе ўперадзе — ззаду рухаліся толькі некалькі байцоў, падганяючы або расстрэльваючы тых, хто аставаўся. Раптам Алесь апаў на дол, ня маючы магчымасьці трымацца ў вертыкальным стане. І якраз у гэты момант скакаў да іх Нэрон. Спалохана пачалі падымаць Алеся. Але самі былі зьнясіленыя, і той, раз па разу, высклізаў з рук. — Як улагодзіць гэтага чалавека? — думаў Кузьма аб Нэроне. — Як яго ўміласьцівіць? — Абраз расстрэлу ажыў перад яго вачыма і яму самому рабілася кепска. Алесь! Ён жа таксама невінаваты, як і я! Сэрца ня знойдзе супакою. Нагнуўся над Алесям, стараючыся абхапіць яго за плечы і паставіць на ногі. Орлік дапамагаў з другога боку. І ў гэты час падскочыў Нэрон.

— Вперад! — крыкнуў ён.

Кузьма ўраніў сябру, выпрастаўся і з благаньнем паглядзеў на начальніка.

— Дазвольце глыток вады — з чалавекам нядобра! — сказаў.

— Вперад!

І Кузьма і Орлік апусьцілі рукі, але ўсё ж зь месца ня рушыліся, засланяючы сабой ляжачага на пяску сябру.

— Контра? — раптам спытаў Нэрон.

— Крымінальныя! — зь нейкім нутраным пад'ёмам ухапіўся за гэта Кузьма. — У дошку свой...

— Памылкова залез не ў сваю кішаню... усе ўтрох накрытыя на месцы...

Веданьне блатнога жаргону, як відаць, пераканала Нэрона, і рука ягоная з нацэленым на Алеся вочкам нагану пасьлізнулася ўніз.

— Калі б контра, самі коцнулі б, не чакаючы помачы «архангела», — дадаў ужо сьмялей Кузьма.

Жорсткія людзі заахвочваюць жорсткасьць і ў іншых, і Нэрон фыркнуў, быццам конь у сьпякоту.

— Упал, лучше всего облегчить его выстрелом...

І вочка зноў пачало падымацца ўгару. Кузьма і Орлік не адводзілі зроку ад гэтага кружка, у якім таілася сьмерць.

— Страляй тады ўжо ўсіх трох, Нэрон! Можна сказаць, аднэй цыцкай выкармлены.

І Кузьма сарваў з галавы шапку, як бы падстаўляючы лоб пад люфу нагану.

Мянушка — Нэрон, як відаць, падабалася начальніку, і ён гучна зарагатаў. Потым паклаў руку на кабуру. Кузьма заплюшчыў вочы, але стрэл не наступіў...

— Паехаў? — спытаў Алесь, на гэты раз зусім бязудзельна. — Але на што вы мяне мучаеце?

Орлік у гэтыя дзьве-тры хвіліны амаль ня жыў. Сэрца, здавалася, некуды адляцела, і ў галаве не было ніякіх думак. Калі ж пачуў голас Алеся, увесь уздрыгнуўся.

— Зразумей, чалавек за цябе ахвяраваў жыцьцё! — крыкнуў.

— Ён хворы! — ціха сказаў Кузьма.

— Вы жадаеце, каб я ішоў... у імя дружбы?

— Калі ты ня можаш ісьці, мы цябе панясём.

— Добра, я пайду!

Ён падняўся, але хутка пачаў зноў ападаць. Сябры яго падхапілі — адзін справа, другі зьлева.

— Ну, вось так, Алеська, — загаварыў з ласкай Кузьма. — Цяпер абхапі мяне за шыю левай рукой, а Орліка правай.

Калі Нэрон параўняўся зь імі зноў, скачучы да галавы калёны, яны ўжо амаль дагналі астатніх. Зьняўшы шапку, Кузьма ў нейкай экстазе ўзьняў свой худы твар да неба. Уздыхнуў. І ў гэты мамэнт адчуў: наўкола іх адбываецца нешта надзвычайнае; адна хвіліна можа прынесьці сьмерць, але гэтая ж хвіліна можа даць ім і волю. Падбадзёрваў Алеся, ведаючы добра з дасьведчаньня, што гэта найлепей захоўвае сілы.

— Вось, ужо хутка, ужо хутка... Ты, чуеш, Алесь, як нейдзе грукочаць панцыры? Гэта ж рухаецца фронт і тады... Адступаюць! Ты ж дагадваесься й сам, што адступаюць? Алесь, можа быць праз паўгадзіны мы будзем вольныя?! І вось, калі-небудзь зьбярэмся і будзем сьмяяцца з усяго гэтага... Так! Мы рухаемся павольна, а фронт увесь час даганяе. Таму і расстрэльваюць... Зразумей!

— Фронт ідзе, кажаш? А хто ідзе?

— Хто б ня йшоў, нясе нам волю...

— Ціха, нешта адбываецца ўперадзе!

Запраўды, калёна нечакана тузанулася ўбок, і ўсьлед за тым пачаўся трэск кулямётаў.

— Мабыць расстрэльваюць усіх упокат...

— Не, нешта іншае. Калёна павярнулася назад. Так, назад ідуць!

Праз хвіліну-дзьве насустрач ляцела аўта з двума вайсковымі тузамі ў ім. Пыл засланіў усё. Калі, напасьледак, небасхіл адкрыўся, паказаўся ўсхваляваны Нэрон, які размахваў наганам і крычэў:

— Назад!.. Верни с шоссе... Постреля-я-ю!..

Але дарожка была вузкай, жыта па бакох яе высокім, і зьняволеныя, паварачваючыся, губляліся ў ім з галавой. Па іх секлі аўтаматы канваераў.

— Дэсант уперадзе! — у вадзін мамэнт пранеслася па натоўпе. Орлік і Кузьма, сабраўшы ўсе свае сілы, выкарысталі мітусьню, каб адарвацца ад калёны. Як толькі яны апынуліся ў жыце, страшны абраз зьнік. Чуліся толькі крыкі:

— Вярні!.. Пастраля-я-ю!.. Тррр!..

Але кулі ляцелі некуды далёка, бо скачок быў зроблены ў бок, супрацьлеглы таму, куды ськіроўвалася калёна.

Ляглі. Калі калёна, мяркуючы па рухах, крыху аддалілася, папаўзьлі. Але сілы не ставала. Алесь пачаў губляць сьведамасьць. Яго трэба было рухаць неяк на руках. Праз кажныя дзесяць шагоў адпачывалі. А недалёка, адкуль павярнула калёна, адбывалася бойка: трашчэлі кулямёты, бухалі гарматы і, быццам каршун, кружыў самалёт. Выбухла бомба, як відаць, ськінутая самалётам. Зямля варушылася пад нагамі. Потым самалёт павярнуў да іх, ляцеў над шашой, па якой маглі рухацца часткі чырвонага войска. Калі ён пралятаў над галавой, яны бачылі чорныя кругі, а ў іх адзнакі чужой дзяржавы. Іх гэта не палохала, — толькі адпаўзьлі далей ад дарогі. У канцы жыта адчынілася лонка. Вады ў ёй не было, але мох утрымліваў вільгаць. Яны пападалі ў яго і пачалі доўга і прагна смактаць. Алесю стала лягчэй. Кузьма і Орлік ляглі ў траву.

Кузьма ўсё яшчэ ня верыў, што гэта вызваленьне. Хутка пяць год, як яго арыштавалі. Успомніў Падкаблука, абраз якога быў да гэтага заслонены больш агіднымі тыпамі. Увесь гэты час кажны ягоны рух кантраляваўся. Паспрабаваў падняцца — і яго ніхто ня спыніў. Паваліўся тварам на зямлю і пачаў удыхаць ейныя пахі. Потым запусьціў пальцы ў траву, нібы баючыся, што яго ад яе адарвуць. І, як жывая, паўстала маці. — Як жа зрабіць, каб яе не спалохаць? — падумаў.

Орлік заўважыў:

— Як бы я цяпер хацеў спаткацца з сваім сьледчым і з гэтым начальнікам канвою!

— З Нэронам?

— Не, з гэтым...

— Ну, гэта й ёсьць Нэрон! — растлумачыў Кузьма. — Ды, здаецца, і ў месьце яго іначай не называюць.

Пачаў глядзець у неба. Там плылі лёгкія белыя воблачкі. — Якое шчасьце карыстацца з волі! — падумаў. Потым да Орліка:

— Не, дружа, я нічога не жадаю; атрымаў усё, чаго жадаў...

І ён закрыў вочы і доўга ляжаў так моўчкі.

Бойка цягнулася нядоўга — хвілін дзесяць-пятнаццаць. Самалёт зьнік. Ужо даўно заціх і рух калёны. Цяпер можна было паглядзець, што робіцца наўкола. Падняліся з травы: нідзе ніякага жыльля не было. А есьці й піць хацелася жудасна. Кажны трымаў у руках пучок моху і высмоктваў зь яго вільгаць. Калі б жыта было сьпелым, можна было б падмацавацца каласамі. Але яно толькі пачало налівацца. Ірвалі і елі шчаўё. І зноў ляжалі ў траве, бо ногі млелі і слабелі. Алесь увесь час спаў. Твар ягоны стаў жоўта-зялёным, пад вачыма апухліна й чорныя кругі. Дыхаў цяжка і няроўна. Ён цяпер уяўляў для іх праблему: як яго несьці, дапамагчы мэдыцынскім аглядам, накарміць? Уткнуўшыся тварам у мох, Орлік капаўся ў сваей памяці. Некалі, разам зь іншымі студэнтамі, ён быў мабілізаваны на час летніх вакацыяў на торфараспрацоўкі. Успаміналася, ехаў па гэтым жа гасьцінцы. Калі б торфзавод знайшоўся блізка, было б добра. Там ёсьць мэдыцынскі пункт і жыве знаёмы лекар. Алеся можна было б, як колечы, дацягнуць. А можа, нават дасталі б і фурманку. Але памяць нічога не магла падказаць. Кузьма ўсё яшчэ ніяк ня мог нацешыцца воляй. Ляжаў і глядзеў на ўсё наўкола, як на нейкі цуд. Трава, лес, воблакі, птушкі й казюлькі, якія стаялі наўкола і праляталі над ім, былі цяпер яму нейкімі блізкімі й роднымі. Да арышту ён ніколі не адчуваў гэтага.

— Ляжу і думаю, — раптам прамовіў да Орліка, — воля можа быць куплена толькі няволяй! Вось чаму ім так добра сходзяць справы там, за мяжой. Людзі, якія ня жылі тут, ніяк ня могуць зразумець нас. Пяць год, як я травінкі ня бачыў! За што?

Вочы Кузьмы задуменна глядзелі ў далячынь. Раптам з таго боку, дзе праходзіла шаша, з жыта выйшаў чалавек. Ад яго клаўся на траву доўгі цень. Было відавочным — гэта вайскавік. З правага боку каля пояса нават тырчэла кабура. Кубікі на пятліцах сьвяціліся ружовым бляскам. На грудзях пабліскваліі нейкія адзнакі. Кузьма й Орлік пасьпешна схаваліся ў траву, але чалавек усё ж іх заўважыў; ішоў да іх, трымаючы руку на кабуры.

— У выпадку чаго, трэба яго абяззброіць! — заўважыў Орлік.

— Голымі рукамі? — запратэставаў Кузьма.

— Нават і голымі! — станоўча адказаў Орлік. — Лепш памерці ў змаганьні, чым зноў трапіць у іхныя рукі.

Але чалавек, падыйшоўшы бліжэй, гучна й па-сяброўску засьмяяўся.

— Арыштанты? — запытаў, водзячы па іх зрокам.

Сябры маўчалі.

— Не палохайцеся! Такімі тут перапоўнена жыта... І жывымі й мёртвымі...

Чалавек перасунуў пас з кабурай за сьпіну і сеў каля іх. Яму было год каля трыццаці пяці. Бялявы, лейтэнант, з ордэнам Леніна на грудзях. Сінія вочы глядзелі спакойна й ласкава. Шырока раставіў ногі, непамерна доўгія параўнаўча з тулавам. Апусьціў галаву; ад гэтага фігура нябыла некаторую сутуласьць. Прамовіў зноў:

— Разьбегліся ўсе: арыштанты й не арыштанты, генэралы й байцы, сябры партыі й беспартыйныя. А ЦККП(б)Б на чале з сакратаром Панамарэнкам ганебна ўцёк першым. Дваццаць тры гады балбаталі пра абарону, умацоўваліся, ачышчаліся, зьнішчалі ворагаў, замыкалі граніцу на замок, будавалі танкі й адлівалі гарматы, а разьляцелася ўсё зноў жа за дваццаць тры гадзіны ад першага ж удару. Арміі няма — пайшла ў палон. Прабіваюцца ў тыл толькі паасобныя часткі. Гарматы й танкі ляжаць на дарогах. Самалёты згарэлі на аэрадромах! — Павольным позіркам зірнуў на ўпрыгожаныя ордэнам грудзі. Раптам даўгаватыя пальцы скорчыліся, як у драпежнай птушкі, і ён шпаркім, можа быць, нечаканым нават для самога сябе рухам учапіўся за ордэн Леніна.

— Чортава бляха! — выкрыкнуў.

Адарваў ордэн, сагнуў яго, зламаў і кінуў у балота.

— Колькі пакутаў прынёс мне гэты кавалак бляхі!

Змоўк. Цяпер яго ўжо не баяліся. Орлік зацікавіўся:

— За Фінляндыю, мабыць, узнагародзілі?

Лейтэнант узьняў вочы й доўга глядзеў на яго, быццам не разумеючы, аб чым пытаюцца.

— Так, за Фінляндыю! — адказаў напасьледак.

Задзёр на жываце кашулю. Паказаўся вялізны сіняваты шрам.

— Шрапнэль! — прамовіў.

Закасаў рукаво на правай руцэ.

— Куля!

Зьняў абодвы боты, паказваючы пакрамсаныя ікры галеняў.

— Таксама шрапнэль!

Зноў замоўк.

— Досыць, наваявалі! Прабіваюся да сваіх, дамоў...

— А вы адкуль?

— З-пад Менску. Шукаю жонку зь дзіцем, была недалёка тут на летнішчы. Хто ведаў, што так хутка вайна? — Зноў маўчаў. — А гэта што — хворы?

— Так, у яго на допытах пашкоджаны рэбры...

— Так, ламалі рэбры й ламаюць. Колькі з гэтай няшчаснай Беларусі пагінулі ў вязьніцах, на Калыме, за Ўралам? Раней, за царамі, ехалі самі ў пошуках вольнай зямлі й скарынкі хлеба, ехалі й паміралі, як мухі, у дарозе. А цяпер як кулакоў, нацдэмаў, непажаданы элемэнт з пагранічча... Палітычныя? — запытаў празь некаторы час. — Пэўна, з студэнтаў? Сярод іх усё раскрывалі ўсякія змовы...

— Студэнты, — адказаў Орлік. — Ён, вось, — паказаў на Кузьму, — адпарыўся каля пяці год на гэтай самай Калыме, увесну патрабавалі справу на перагляд і нас прышылі...

— Ага, разумею! Доказаў не было, успомнілі старое...

Прачнуўся Алесь.

— Нядобры выгляд у яго, — заўважыў лейтэнант.

І, адшпіліўшы ад пояса торбу, зазірнуў у яе.

— Што ж вы зь ім мяркуеце рабіць?

— Як-небудзь дабірацца да сваіх.

— Далёка?

— Мае бацькі кілямэтраў за сто адсюль, — сказаў Орлік. — Яго, — паказаў на Кузьму, — трохі бліжэй, сам жа хворы — зь Віцебску.

— У Віцебск не дабярэцеся — гэта відавочна. Да каго-колечы з вашых сваякоў. Але ці давядзеце? Яму ж, перш-наперш, патрэбна апэрацыя, калі рэбры запраўды паламаныя.

— Тут, недзе недалёка, ёсьць торфзавод, — адказаў Орлік. — Там у мяне знаёмы лекар.

— Так, торфзавод імя Ва-ара-ашылава, кілямэтраў за дванаццаць. Але як вы да яго з хворым дабярэцеся?

— Небясьпечна?

— Небясьпека, бадай, мінула, — хіба толькі немцы могуць патрывожыць, напрыклад, да закапваньня трупаў, якімі ўсеяны дарогі...

Орлік пачаў расказваць, як цяжка ім было ў дарозе і як хацелі Алеся прыстрэліць.

— Так, б'юць нас, б'юць! — уздыхнуў лейтэнант. — Гэтая вайна адкрыла мне вочы: Менск гарыць, гараць гарады й сёлы ад Бугу да Дзьвіны, Прыпяці й Дняпра!.. Каму патрэбная вайна — нам? Ваююць Масква й Бэрлін!..

Меў звычай перарываць гутарку й думаць.

— І так будзе датуль, пакуль ня возьмем свой лёс у свае рукі... Аддаю рацыю нашым нацдэмам, якіх раней не разумеў; адгарадзіцца ад захопніцтва і з захаду і з усходу неабходна...

Адкрыў торбу і выняў адтуль тэрмас зь нейкай вадкасьцю, здавалася, цёплай. Потым дастаў хлеб, пакроены на кавалачкі, каўбасу і якраз беларускую, вясковую. Пах яе раздражняў апэтыт Орліка й Кузьмы. Лейтэнант сказаў:

— Пакуль што падмацуемся, чым Бог дараваў, як кажуць у нас простыя людзі.

Дастаў з торбы таксама масла, акуратна ўпакаванае ў ружовую скрыначку. Памазаў чатыры кавалкі хлеба. Адрэзаў столькі ж кавалачкаў каўбасы і таксама паклаў на хлеб.

— Ну, пачнём, сябры па няшчасьці.

— Не, дзякуем! — адказалі ў вадзін голас і Кузьма і Орлік. — Вось толькі, калі можаце, падмацуйце нашага хворага сябру — яму гэта вельмі неабходна, асабліва кава!

— Падумана і аб ім! Усё прадугледжана!

Адкруціўшы ад тэрмаса вечка, наліў у яго нечага, але толькі ня кавы і, разам з хлебам, падаў хвораму.

— Віно, — сказаў. — Гэта падтрымае сілы лепей, чым кава, якой на гэты выпадак якраз і няма. Выпіце адразу ўсё, а потым закусіце!

Наліў і Кузьме, у якога выгляд быў таксама вельмі дрэнны. Потым Орліку і сабе. Тэрмас зноў паставіў у торбу.

— Гэта пакінем, можа быць пільна спатрэбіцца.

Сонца ўжо стаяла над самым лесам. Ад травы на лонцы падымалася пара. Недзе недалёка запілікала перапёлка. Жаўрукі, як гэта бывае заўжды перад заходам у ціхі й сонечны вечар, падняліся ізь сьпевамі ў неба.

— Вось бачыце, нават птушкі дзякуюць прыродзе, што яна дала ім магчымасьць пражыць дзень! А мы, людзі, усё забылі! — Памаўчаў. — Не забылі толькі адзін аднаго рэзаць на дарогах...

Студэнты адчулі да лейтэнанта яшчэ большую сымпатыю.

— Колькі добрых людзей на нашай зямлі! — падумаў уголас Кузьма. — І як іх не псуюць, не калечаць, а натура, традыцыі здаровага сэнсу бяруць сваё!

— Цяпер час і ў дарогу!

І, дастаўшы свой нож, лейтэнант ськіраваўся да альховых кустоў, што расьлі па краёх лонкі. Выразаў дзьве даволі тоўстыя і доўгія палкі, іншых некалькі карацейшых. Зьвязаў даўжэйшыя па канцох пасамі так, каб атрымаліся насілкі. Потым нарэзаў гальля і ўслаў імі тое, што атрымалася.

— Вось так мы яго й панясём! — заўважыў. — Я з аднаго канца, як найбольш мацнейшы, а вы ўдвух з другога. Думаю, што пераможам гэтыя дзесяць кілямэтраў.

— Які ваш плян?

— Тут няма чаго доўга думаць над плянам — трэба ратаваць жыцьцё чалавеку!

— Божа мой, дарогі ўсеяныя трупамі нявінных! — уздыхнуў Кузьма.

— Абавязак чалавека ратаваць да апошняга мамэнту, а не забіваць, хаця гэта й гучыць ад мяне як парадокс?

— Бачыце, я на гэта гляджу трохі глыбей, — умяшаўся Орлік. — Вайна ў вабароне...

— Якраз! Але гэтая вайна не ў інтарэсах нас самых, а толькі партыйнае касты... І так, дабярэмся да бацькоў маёй жонкі, а адтуль на фурманцы да вашага лекара...

На захадзе яшчэ шугала зара. Але тут, паміж жыта, ужо клаўся змрок. Лонка схавалася пад парасонам туману. У густой траве, пад гэтым парасонам, надрываўся драч. Тры чалавекі ўзьнялі насілкі й рушыліся ў дарогу. І ў гэты час, як бы па ўмове, закукавала зязюля:

— Ку-ку! Ку-ку!

Зь містычным пачуцьцём Кузьма ўздрыгнуўся.

— Янка сеяў — людзі жалі,

А зязюлька кукавала:

Ку-ку! Ку-ку!

— Вось і адкукаваў! — уздыхнуў.

— Будзе жыць! — у гэты ж час прамовіў Орлік. — Я лічыў: сорак і адзін раз.

— Гэта ты пра Алеся?

— Пра яго.

— Зязюлька распачлівая птушка — гэта пэўна! — заўважыў лейтэнант.

— Вось з-за гэтай распачлівай птушкі я й адпарыўся каля пяці год на Калыме! — адгукнуўся Кузьма.

І пачаў расказваць лейтэнанту ўсю гісторыю з пачатку. Калі скончыў, зрабіў вывад:

— У вершы народнага паэты сьпяваецца аб іншым, аб селяніне Янку, які сеяў, а людзі жалі... Зязюля тут толькі наш родны калярыт. Але, бачыце, птушка ня робіць сабе гнязда, лічыцца бяздомнай, таму ГПУ палічыла прадэклямаваны мною верш за зьдзек над савецкай уладай і мне прышылі агітацыю супраць калгаснага будаўніцтва, абарону кулака й насьмешку зь беднаты, а разам зь імі й нацдэмаўшчыну, каб было больш пераканаўча...